УДК 94+98 (476)
ББК 63.3(4 Беи)
Г31

*Рэкамендавана вучэбна-метадычным аб'яднаннем па педагагічнай адукацыі ў якасці вучэбна-метадычнага дапаможніка для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі, якія навучаюцца па спецыяльнасцях 1-02 01 01 Гісторыя, 1-02 01 02 Гісторыя. Дадатковая спецыяльнасць*

Аўтары:
І. І. Багдановіч, М. Ф. Бандзелікаў, Д. У. Дубінін, Г. А. Калечыц,
А.У. Калядзінскі, А.У. Канойка, А.А. Корзюк

Пад рэдакцыяй кандыдата педагагічных навук,
дацэнта *А. А. Корзюка*

Рэцэнзенты:

*С.В. Паноў* — кандыдат педагагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы

*А.І. Філімонаў* — кандыдат гістарычных навук, дацэнт, загадчык лабараторыі сацыякультурнай адукацыі навукова-метадычнай установы «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Г31 Гістарычнае краязнаўства Беларусі: вучэбна-метадычны дапаможнік / І.І. Багдановіч [і інш.]; пад рэд. А. А. Корзюка. — Гродна: ЮрСаПрынт, 2014. — 220 с.
ISBN 978-985-99335-8-5

У дапаможніку разглядаюцца пытанні комплекснага навуковага вывучэння гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі, метадаў яе зберажэння і выкарыстання. Важнае значэнне надаецца фарміраванню ў будучых настаўнікаў гісторыі беражлівых адносін да гісторыка-культурных каштоўнасцей і практычных уменняў выкарыстання тэарэтычных ведаў у галіне краязнаўства ў вучэбнай і пазакласнай рабоце.
Адрасуецца студэнтам гістарычных факультэтаў дзённай і завочнай форм атрымання адукацыі, настаўнікам гісторыі агульнаадукацыйных устаноў, усім, хто цікавіцца гістарычным краязнаўствам.

ISBN 978-985-99335-8-5

УДК 94+98 (476)
ББК 63.3(4 БЕИ)

© Афармленне
ТАА ЮрСаПрынт, 2014

# ГІСТАРЫЧНАЕ КРАЯЗНАЎСТВА БЕЛАРУСІ

*Вучэбна-метадычны дапаможнік*

Гродна
«ЮрСаПринт»
2014

Репозиторий БГПУ

2. Селицкий А.А. Живопись Полоцкой земли XI–XII вв. Минск, 1992.
3. Калядзінскі Л. Віцебскі храм Святога Міхаіла // Весці АН Беларусі. Серыя гуманітарных навук. 1995, № 1. С. 59-66.
4. Свирин Г. Древняя Каложская церковь во имя Св. кн. Бориса и Глеба в г. Гродно — наша память, наша история // Тэзісы навуковай канферэнцыі, прысвечанай 1000-годдзю Полацкай епархіі Праваслаўнай царквы на Беларусі. Мінск, 1992. С 66-68.
5. Ткачоў М.А. Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі XIII–XVIII ст. Мінск, 1978.
6. Раппопорт П.А. Военное зодчество западнорусских земель X–XIV вв. МИА, 1967. № 140.
7. Полное собрание русских летописей. Т. 2.
8. Трусаў А.А. Старадаўніх муроў адраджэнне: мінулае і сучаснасць Лідскага замка / з серыі «Помнікі Беларускага дойлідства». Мінск, 1990.
9. Архітэктура Беларусі: нарысы эвалюцыі ва ўсходнеславянскім і еўрапейскім кантэксце. У 4 т. Т. 4, кн. 2. Архітэктура XX — пачатку XXI ст. / А. І. Лакотка і інш. Мінск, 2009.
10. Шамрук А С. Архитектура Беларуси XX — начала XXI в. Минск, 2007.

**Дадатковая:**

11. Габрусь Т. Архітэктура // Вялікае Княства Літоўскае. Энцыклапедыя: ў 3 т. Мінск, 2005. Т. 1. С. 130-131.
12. Дзярновіч А. Замак // Вялікае Княства Літоўскае. Энцыклапедыя: ў 3 т. Мінск, 2005. Т. 1. С. 643-646.
13. Ткачёв М.А. Замки Белоруссии. 2-е изд. Минск, 1987.
14. Ткачоў М.А. Замкі і людзі / пад рэд. Г.В. Штыхава. Мінск, 1991.
15. Трусаў А.А. Манументальнае дойлідства Беларусі XI–XVIII стагоддзяў. Гісторыя будаўнічай тэхнікі. Мінск, 2001.
16. Трусаў А.А. Старонкі мураванай кнігі: манументальная архітэктура эпохі феадалізму і капіталізму. Мінск, 1990.
17. Трусов О.А. Памятники монументального зодчества Белоруссии XI–XVII вв. Архитектурно-типологический анализ. Минск, 1988.
18. Чантурия В.А. История архитектуры Беларуси. Минск, 1969.



# ГЛАВА 7

## Садова-паркавае мастацтва Беларусі

*1. Станаўленне і развіццё садова-паркавага мастацтва. Гістарычныя вытокі дэкаратыўнага садаводства.*
*2. Рэгулярныя паркі эпохі барока і французскага класіцызму.*
*3. Пейзажныя натуралістычныя паркі. Пейзажныя паркі перыяду эклектыкі (другая палова XIX — пачатак XX ст.).*

**1.** Культура садоў і паркаў лічылася адной з найбольш важных са старажытных часоў. Развіццё садова-паркавага мастацтва вызначаецца сацыяльна-эканамічнымі ўмовамі і філасофіяй грамадства. Таму ў старажытных парках адлюстроўваюцца эстэтычныя погляды і ўклад жыцця іх стваральнікаў. На жаль, многія з садова-паркавых комплексаў Беларусі безваротна страчаны. Але тое, што засталося, — гэта неацэнная спадчына, якая з'яўляецца асновай для далейшага развіцця гэтай галіны.

Сістэматычным вывучэннем паркаў Беларусі, пачынаючы з 60-х гг. XX ст., займаліся А. Т. Федарук [1] і А. М. Кулагін [2]. Усяго на Беларусі апісана і даследавана 588 аб'ектаў садова-паркавага мастацтва. У тым ліку ў Брэстскай вобласці — 137, Гродзенскай — 149, Гомельскай — 48, Віцебскай — 94, Мінскай — 111, Магілёўскай — 49. Але шмат помнікаў садова-паркавага мастацтва яшчэ не даследавана, асабліва тых, што былі створаны ў невялікіх населеных пунктах.

Беларускае паркавае будаўніцтва прайшло даволі доўгі і складаны шлях у сваім развіцці: ад зёлкавых агародаў і фруктовых садоў да складаных твораў садова-паркавага мастацтва. У гэтых творах знайшлі адлюстраванне лепшыя рысы сусветных мастацкіх стыляў. Ідэі заходнееўрапейскага мастацтва выкарыстоўваліся тут з улікам мясцовых прыродных умоў і побытавых традыцый.

Яшчэ на пачатку сваёй гісторыі славяне разам з культурай жыта і вінаграда займаліся развядзеннем пладовых дрэў. На Беларусі пад час раскопак Верхняга замка ў Полацку ў археалагічным слоі пачатку XIII ст. была знойдзена костка вішні. У сярэднія вякі сады меліся пры манастырах і замках феадалаў. У



Репозиторий БНТУ